Бацькаўшчына. У пошуках страчанага

# ДАРОГАМІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ

**2024-ы — 110 гадоў з пачатку Першай сусветнай, Вялікай, як яшчэ яе называлі, вайны. І філакартычныя багацці, старыя паштоўкі, у тым ліку з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава, — велізарны збор сведчанняў, якія змянілі ўяўленні чалавецтва пра маштабы ахвяр, пра саму ваенную тэхніку, скіраваную несці ў грамадства смерць, жахі, страты, трагедыі...**

Спярша маскоўскія, екацярынбургскія, петраградскія, краснадарскія, рыжскія выдавецтвы, а таксама Дамскія, Скобелеўскія, Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца камітэты тыражавалі паштоўкі з выявай самога манарха і галоўнага героя — імператара Мікалая II. А следам — карыкатуры на Вільгельма II і маляваныя мініяцюры казака Кузьмы Фірсавіча Кручкова, які стаў першым кавалерам Георгія ў вайне, уся праўда пра якую яшчэ была наперадзе. А тады, на пачатку драматычных падзей, партрэты Кручкова друкавалі на каробках папярос, запалак і цукерак. Подзвіг казака быў апісаны ў песні, пра Кузьму знялі фільм... Соф'я Фядорчанка, тады сястра міласэрнасці, яшчэ толькі рабіла першыя запісы для будучай кнігі «Народ на вайне», падслухоўваючы параненых па дарозе з Польшчы, Брэста да самага Гомеля. Мяняўся настрой, зразумелым станавіўся боль — асабісты, сардэчны, а таксама грамадскі, са спробай зразумець, што ж прынясе вайна заўтра, — мяняліся і тэмы паштовых мініяцюр.

А былі яшчэ і невядомыя паштоўкі, тыя фатаграфічныя звароты, якія стануць пазнавальнымі і зразумелымі шмат пазней, праз дзесяцігоддзі. На іх цяжка было знайсці пераможны выраз твару. Нават калі «карцінкі» гэтыя знаёмяць нас з ваякамі смелымі, усмешлівымі... Велізарны масіў такіх філакартычных памятак, шмат якія і сёння падаюцца сапраўднымі адкрыццямі гістарычнай праўды, у калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава прадстаўлены тэмай Першай сусветнай вайны. Частка паштовак — гэта ілюстрацыі вайны, створаныя салдатамі і афіцэрамі на другім баку фронту. У свой час Уладзімір Аляксеевіч і альбом нават асобны выдаў — з рэпрадукцыямі паштовак, якія былі адбіткам убачанага нямецкімі вайскоўцамі. Баюся памыліцца і не спрабую адгадваць, якімі вачыма ўбачылі вайну яны, учарашнія сяляне, рабочыя, настаўнікі, гандляры, рамеснікі, вучоныя і, відаць, пісьменнікі, мастацтвазнаўцы, і, вядома ж, прафесіянальныя вайскоўцы, уцягнутыя сваімі праваднікамі ў бездань, у вір трагедыі... Але ось усвядомлена сцвярджаю, што свету і гісторыі яны пакінулі сведчанні, якія ні на кроплю не адрозніваюцца ад памятак, зробленых па другі бок акопаў.

...Кобрын. Яшчэ толькі сышоў з гэтых мясцін палявы санітарны атрад, у якім нёс службу Канстанцін Паўстоўскі, будучы класік рускай савецкай літаратуры. А немцы паспяваюць занатаваць Рыначную плошчу, руіны па Брэсцкай вуліцы, мост праз Мухавец. І два здымкі распавядаюць пра санітарны батальён і шпіталь, які размясціўся ў Кобрыне.

Многія здымкі носяць альбомны характар, сам факт іх з'яўлення ў гісторыі звязаны з традыцыйнай весялосцю ад атрыманых трафеяў, жаданнем паказаць сябе ўдалымі і разбітнымі ваякамі. Зусім як па Швейку: «Мы — солдаты-молодцы, // Любят нас красавицы...» Як у Гродне ў 1915 годзе... Добрае адлзяленне нямецкіх салдат узбілася на платформу трафейнай рускай «бамбардзіры». Палова з іх забралася на самы верх ствала гарматы. Шчаслівыя, відаць, таму, што пакуль што не трапілі пад асколачны снарад такой сур'ёзнай зброі.

Час захаваў і здымак рускага снарада, які не разарваўся. Адправіўшы да варожых пазіцый каля берагоў Нарачы смертаносны груз, рускія бамбардзіры спадзяваліся, што «падарунак» дасягне мэты. Але вось не разарваўся і захаваў, мяркуючы па яго дыяметры, многія і многія жыцці. Наўрад ці насмешлівыя нямецкія салдаты, якія асядлалі рускую гармату ў Гродне, маглі ведаць, што ў Першую сусветную Расія ўвайшла з запасам артылерыйскіх боезапасаў усяго толькі на некалькі лічаных месяцаў. Майстры ладзіць прагнозы планавалі, што вайна запатрабуе ніяк не больш чым пяць з паловай мільёнаў артылерыйскіх снарадаў. Прыблізна гэтулькі і было ў Расійскай імперыі. А толькі штомесячная (!) запатрабаванасць у снарадах ужо ў 1915 годзе складала тры мільёны... Ваенная прамысловасць не стаяла на месцы. Вядома ж, не толькі ў Расійскай імперыі. Хоць і скардзіўся сваёй каханай у лірычным лісце адмірал Калчак: «Падводная лодка і аэрапланы псуюць усю паэзію вайны. Страляць даводзіцца ў нешта нябачнае, такая ж нябачная падводная лодка пры першай жа памылцы ўзарве карабель, сама зачастую не ведаючы і не разгледзеўшы рэзультатаў; лятае нейкая гадзіна, у якую амаль немагчыма патрапіць. Нічога для душы няма...» Немцы ж сур'ёзна «апаэтызавалі» артылерыю, стварыўшы на канцэрне Крупа легендарную «Вялікую Берту», якая магла адпраўляць снарад у 900 кілаграмаў (!) на адлегласць да 14 кіламетраў. Асколкі ад «Берты» складалі да 15 тысяч кавалкаў металу. Не выратоўвала ад бранябойных снарадаў нават сцяна са сталі і бетону двухметровай таўшчыні. Таму крэпасці ў Першую сусветную згубілі сваё заўсёдные абаронча прызначэнне. Праўда, калі ўважліва аглядаць тэатр ваенных дзеянняў Першай сусветнай на тэрыторыі Беларусі, сваю ролю адыграла яшчэ і кавалерыя. Чытаем у справаздачы, напісанай амаль праз чвэрць стагоддзя пасля вайны: «...Поспех германцаў у Віленска-Маладзечанскай аперацыі трэба цалкам аднесці да заслуг 6-га коннага корпуса генерала Гарнье. На працягу ўсёй аперацыі гэты корпус, які ўварваўся ў тыл, а затым і ў аператыўную глыбіню рускага Заходняга фронта, вёў за сабою ўдарную групоўку 10-й Германскай арміі...»

Здымкі, якія засталіся ў ваенным крыніцазнаўстве дзякуючы нямецкім салдатам і афіцэрам, расказваюць пра Беларусь не толькі ваенную, напоўненую ўсім драматызмам разбурэнняў і знішчэнняў. Чужаземных нявольнікаў вялікай мілітарысцкай палітыкі прыцягвалі невядомыя дагэтуль гістарычныя, архітэктурныя ландшафты. Фатографам былі цікавыя людзі, чый побыт нечым адрозніваўся ад знаёмага ім нямецкага, прускага жыцця. І глядзіш: усміхаюцца на паштоўках, аддрукаваных у нямецкіх друкарнях, нашы з вамі прашчуры. Часам, відаць, і горка ўсміхаецца пакаленне, якое выпрабавала на сабе чарговую драматычную трагедыю... Усміхаюцца перад аб'ектывам нямецкага салдата людзі, якія яшчэ і не ведалі, не ўяўлялі напоўніцу, што наперадзе іх чакаюць новыя выпрабаванні, новыя палітычныя і сацыяльныя, грамадскія разломы. А яны і крыві прынясуць не менш, чым Першая сусветная...

Уладзімір Ліхадзедаў, чые збіральніцкія памкненні ўражваюць, выдаў нямала філакартычных альбомаў, асновай для якіх сталі старыя паштоўкі, што калекцыянер вышукваў літаральна па ўсім свеце. І Першая сусветная — багаты «персанаж» на старонках гэтых выданняў...

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

**Старыя паштоўкі з калекцыі лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**



Магілёў. Агульны выгляд, 1918 год.




Кобрын. Рынкавая плошча, 1916 год.



Гродна. Трафейная руская гармата, 1915 год.




Нарач. Неразарваны рускі снарад, 1916 год.




Слонім, 1916 год.